# Прынцыпы адказных паводзінаў у краме



Перш чым адправіцца ў краму, я складаю спіс прадуктаў і тавараў, якія збіраюся купіць. Гэта трэба не для таго, каб не забыцца купіць што-небудзь, а для таго, каб купляць менавіта неабходныя рэчы, а не першае, што трапіла на вочы.і



Адпраўляючыся ў краму, я бяру з сабой гаспадарчую сумку ці кошык. Яны не забруджваюць навакольнае асяроддзе і, у адрозненні ад аднаразовых поліэтыленавых пакетаў, выкарыстоўваюцца неаднаразова.



У краме я ўважліва вывучаю ўпакоўкі. Выбіраю такія прадукты і тавары, пасля распакавання і ўжывання якіх застаецца як мага менш адкідаў.



Я выбіраю экалагічна чыстыя прадукты, а не тыя, якія ўзмоцнена рэкламуюцца па тэлебачанні.



Я не імкнуся забаўляць дзяцей, беручы іх з сабой у краму. Калі я на самой справе хачу даставіць ім радасць, то праводжу свой вольны час менавіта з імі, а не займаючыся пакупкамі: мы разам гуляем, ходзім у кіно, басейн, а часцей за ўсё проста размаўляем адзін з адным.